ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 6 (1004) ● ЧАЦВЕР, 1 сакавіка 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

## НАШЫ ВЫДАТНІКІ



*Хто сказаў, што дзяўчына-следчы — гэта нерэальна?! Оля выбрала якраз пракурорска-следчую спецыялізацыю і даказвае права на яе выдатнай вучобай, зацікаўленасцю да навуковай работы і актыўнай грамадскай дзейнасцю.*

*На здымку: Вольга Курылёва, студэнтка III курса юрыдычнага факультэта. Усе тры гады яна выдатніца, сёлета атрымлівае стыпендыю імя Калініна.*

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

## ХРОНІКА УНІВЕРСІТЭЦКАГА ЖЫЦЦЯ

Кветкі, усмешкі, віншаванні... У абставінах шчырасці і сардэчнасці праходзіла ў мінулую суботу расшыранае пасяджэнне вучонага савета БДУ і аддзялення фізіка - матэматычных навук АН БССР, прысвечанае 70-годдзю з дня нараджэння і 50-годдзю навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці акадэміка АН БССР, заслужанага дзеяча навукі БССР, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, дырэктара навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем, загадчыка кафедры фізічнай оптыкі БДУ, Героя Сацыялістычнай Працы Антона Нікіфаравіча Сеўчанкі.

Пасяджэнне адкрыў рэктар БДУ, прафесар У. М. Сікорскі. Аб жыццёвым шляху выдатнага вучонага расказаў яго вучань, прафесар Л. В. Валадзько. Ён падкрэсліў незвычайную плённасць і шырыню навуковых інтарэсаў А. Н. Сеўчанкі, адыграўшых выключную ролю ў развіцці фізіка-матэматычных навук у Беларусі, адзначыў цудоўныя якасці юбіляра, педагога і грамадскага дзеяча.

Многа пранікнёных слоў сказалі імянінніку яго сябры, калегі, вучні, прадстаўнікі грамадскасці універсітэта.

Сардэчна павіншаваў юбіляра ад імя ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і Савета Міністраў БССР і ўручыў яму Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета БССР загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ А. Ц. Караткевіч, Граматы і віншавальныя адрасы ўручылі юбіляру міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, віцэ-прэзідэнт АН БССР Н. С. Махнач, сакратар абкома КПБ У. С. Багданаў, прадстаўнікі інстытутаў, арганізацый і устаноў.

**У панядзелак адбылося чарговае пасяджэнне рэктарата. Абмеркаваны наступныя пытанні: аб правядзенні грамадска-палітычнай практыкі; аб стане і мерах па далейшаму паляпшэнню вучэбна-метадычнай і палітыка-выхаваўчай работы са студэнтамі вячэрняга аддзялення фізічнага факультэта; аб выкананні сметы за 1972 год і праект бюджэту на 1973 год.**

25-годдзю Усесаюзнага таварыства «Веды» быў прысвечан урачысты пленум універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды».

З дакладам аб дзейнасці членаў таварыства выступіў старшыня праўлення арганізацыі таварыства «Веды» БДУ М. Я. Рэзнікаў.

За актыўны ўдзел у лекцыйнай прапагандзе адзначана граматамі Рэспубліканскага таварыства «Веды» і універсітэта вялікая група выкладчыкаў.

Дзесяць чалавек удастоены дыплома Усесаюзнага таварыства за паспяховы ўдзел ва Усесаюзным конкурсе на лепшы твор навукова-папулярнай літаратуры.

Горача павіншавалі лектарскі калектыў прадстаўнікі падшэфных раёнаў.

**У адрас універсітэта прыйшло віншаванне, у якім гаворыцца: «Мангольская асацыяцыя выпускнікоў савецкіх навучальных устаноў горача віншуе калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які ўнёс вялікі ўклад у справу падрыхтоўкі нацыянальных кадраў для МНР, у сувязі са слаўным 50-годдзем з пачатку навучання мангольскай моладзі ў савецкіх навучальных установах і жадае новых вялікіх творчых поспехаў у вашай высакароднай працы».**

## КАНКРЭТНАСЦЬ ПРАЦЫ



НЯДАЎНА прайшоў рэспубліканскі злёт студэнтаў. Лепшая частка студэнцтва Беларусі канкрэтна выказалася па ўсіх напрамках камсамольскага дзеяння для рашэння двуадзінай задачы: падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў, арганізатараў вытворчасці, а таксама высокаідэйных байцоў нашай партыі.

У выступленнях удзельнікаў злёту прагучаў агульны клопат аб канкрэтызацыі ўсёй камсамольскай справы, павышэнні адказнасці кожнага камсамольца за свой грамадскі абавязак, а таксама ўзмацненні кантролю за выкананнем любога даручэння.

У сувязі з гэтым і камсамольскай арганізацыі універсітэта ў трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі, патрэбна канкрэтызаваць сваю працу. Стала прызнанай праца па ліквідацыі не толькі дрэннай адзнакі, але і «тройкі». Толькі гэта праца яшчэ на многіх факультэтах вядзецца бессістэмна, некаторыя камсамольскія работнікі лічаць не абавязковым займацца з першакурснікамі. У выніку здараецца, што акадэмічныя сектары і камісіі не выконваюць свайго прамога выхаваўчага прызначэння. Рэдкія выпадкі, калі акадэмічныя камісіі факультэтаў рэгулярна заслухоўваюць злосных прагульшчыкаў з прадстаўленнем у дэканаты канкрэтных вывадаў.

Камітэт камсамола лічыць, што ў новым паўгоддзі неабходна, каб акадэмічныя камісіі працавалі ў цесным кантакце з куратарамі, дэканатамі. Трэба паставіць працу акадэмічных сектараў так, каб паўторныя прагулы лекцый, частыя спазненні без уважлівых прычын выклікалі разбор персанальнай справы з вынясеннем строгага камсамольскага спагнання.

Набліжаецца 50-годдзе з дня прысваення камсамолу імя У. І. Леніна. У сувязі з гэтым патрэбна шырэй разгарнуць навукова-даследчую працу. А гэта значыць, патрэбна пашыраць сувязі камсамольскіх арганізацый з кафедрамі грамадскіх навук, узяць пад кантроль дзейнасць СНТ факультэтаў, дапамагаць ім у прыцягненні студэнтаў да навуковай працы, арганізаваць шырокую прапаганду навукова-даследчай творчасці ў насценным друку, арганізаваць сустрэчы з лаўрэатамі Усесаюзнага конкурсу. Тэматыка навукова-даследчых работ павінна шырэй ахопліваць слаўны шлях Ленінскага камсамола.

Камсамольскай арганізацыі яшчэ шмат патрэбна зрабіць па далейшаму ўкараненню грамадска-палітычнай практыкі. Цяпер ужо распрацаван атэстат, умовы і парадак правядзення грамадска-палітычнай практыкі на факультэтах і ў групах. На факультэтах праходзяць, а дзе ўжо прайшлі сходы «Кожнай групе, кожнаму камсамольцу — ударную справу». На гэтых сходах у плане грамадска-палітычнай практыкі камсамольцы павінны вызначыць групавыя і індывідуальныя заданні. Асаблівую ўвагу патрэбна скіраваць на выкананне камсамольскіх даручэнняў кожным камсамольцам, бо абыякавасць да грамадскай працы, несумленнасць — першыя прычыны, з-за якіх камсамолец можа не атрымаць залік па грамадска-палітычнай практыцы.

Асаблівую ўвагу камітэты камсамола факультэтаў павінны звярнуць на арганізацыйную работу. У нас яшчэ бываюць выпадкі няправільнай падрыхтоўкі і правядзення сходаў, пасяджэнняў бюро. Сакратары груп нерэгулярна праводзяць сходы, а з боку камітэтаў камсамола факультэтаў не здзяйсняецца своечасовы кантроль.

Дрэнна пастаўлен улік камсамольцаў на фізічным, філалагічным і хімічным факультэтах. Ні сакратары, ні загадчыкі сектараў уліку факультэтаў не здаюць своечасова ў камітэт камсамола універсітэта даных аб перамяшчэнні камсамольцаў, не патрабуюць, каб на ўлік яны станавіліся своечасова, а гэтым самым не выконваюць адпаведныя палажэнні Статута ЛКСМ.

Нягледзячы на некаторыя зрухі ў арганізацыі палітыка-выхаваўчай работы ў інтэрнатах, патрэбна звярнуць увагу бытавых сектараў, студэнцкіх саветаў, камендантаў і прафсаюзных бюро на арганізацыю вольнага часу студэнтаў. Студэнцкаму клубу сумесна з культмасавым сектарам камітэта камсамола патрэбна смялей планаваць мерапрыемствы: выступленні агітбрыгад, лекцыі, гутаркі і г. д. У той жа час патрэбна больш сур'ёзна наказваць тых студэнтаў, якія парушаюць правілы паводзін у інтэрнаце.

Набліжаецца трэці працоўны семестр. Штабам факультэтаў сумесна з камітэтамі камсамола пад кіраўніцтвам партбюро і дэканатаў патрэбна сфарміраваць моцныя баявыя атрады. Не губляючы ні аднаго дня, неабходна спланаваць вучобу камандзіраў і камісараў, спачатку зацвердзіўшы іх у адпаведнасці са статутам БА, вучобу па тэхніцы бяспекі.

Пералічаныя задачы патрабуюць ад кожнага камсамольца, ад кожнага камсамольскага актывіста асэнсавання сваіх магчымасцей, ацэнкі сваіх сіл. Лепш своечасова і чэсна адмовіцца ад якойсьці справы, чым не справіцца з ёй і нанесці ўрон усёй камсамольскай рабоце.

Універсітэцкая камсамольская арганізацыя — гэта моцны калектыў, якому па сіле рашаць адказныя задачы. І ў трэцім, рашаючым годзе пяцігодкі, яна зробіць усё магчымае, каб дасягнуць найлепшых паказчыкаў у сваёй працы.

А. СЛУКА, сакратар камітэта камсамола.

## Ідзе фестываль

**У мэтах паляпшэння фізічнага выхавання шырока разгорнута здача норм ГПА ў рамках Усесаюзнага экзамена па фізічнай і ваенна-тэхнічнай падрыхтоўцы. Пры камітэце камсамола створаны штаб па правядзенню экзамена (начальнік штаба У. Сілін) і камісія з членаў камітэта камсамола, спартклуба і кафедры фізічнага выхавання і спорту. Яны праводзяць шырокую растлумачальную работу сярод моладзі універсітэта аб мэтах і задачах комплексу ГПА. На кожным факультэце аформлены стэнды, здача норм асвятляецца ў насценных газетах.**

**Нядаўна зроблен выезд у падшэфны Стаўбцоўскі раён пад дэвізам «ГПА — у сельскія масы». Выкладчыкі кафедры фізвыхавання і спорту правялі семінар з выкладчыкамі фізкультуры школ раёна, з фізкультурным і камсамольскім актывам па сістэме норм ГПА. Перад удзельнікамі семінара выступіў заслужаны майстар спорту СССР М. П. Крываносаў.**

**У час зорных паходаў па Дзяржынскім, Мядзельскім, Глыбоцкім, Гарадоцкім, Лёзненскім і Полацкім раёнах нашы студэнты правялі цыкл лекцый і гутарак аб новым комплексе ГПА.**

**Добрых інструктараў і грамадскіх суддзяў па спорту рыхтуе факультэт грамадскіх прафесій. Раз у тыдзень слухачы знаёмяцца з тэорыяй, практычныя заняткі праходзяць у час трэніровак. На агульнауніверсітэцкіх і гарадскіх спаборніцтвах студэнты праходзяць судзейскую практыку, акрамя таго, яны ўдзельнічаюць у судзействе ў падшэфным Ленінскім раёне.**

**Традыцыйнымі сталі ва універсітэце спаборніцтвы па трохбор'ю на прыз Героя Савецкага Саюза Амельянюка, спаборніцтвы па многіх відах спорту паміж факультэтамі.**

**Як жа ідзе здача непасрэдна комплексу ГПА? Тут не ўсё добра. На III—IV курсах комплекс здалі 231 чалавек. Плаванне—толькі 306, турызм — 753, грамадзянская абарона — 835.**

**Чым растлумачыць гэта? Перш за ўсё, недастатковай работай камітэтаў камсамола і штабаў па правядзенню экзамена, функцыя якіх не толькі кантраляваць, а і дапамагчы добра арганізаваць справу.**

**24 чэрвеня 1973 года, у Дзень савецкай моладзі, экзамен будзе завершан.**

**ПРЭС-ЦЭНТР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА.**

## Ідзе фестываль

**Фестываль савецкай моладзі прысвечан 50-годдзю ўтварэння СССР. Ён праводзіцца ў мэтах далейшага павышэння працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат у барацьбе за выкананне рашэнняў XXIV з'езда КПСС, паляпшэння эстэтычнага, фізічнага і ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі. Зыходзячы з гэтых галоўных задач фестываля, камсамольская арганізацыя універсітэта распачала вялікую работу па павышэнню паспяховасці студэнтаў. Для гэтага выкарыстоўваецца куратарства савета выдатнікаў над першымі курсамі; у час зімовай сесіі на факультэтах, у групах і інтэрнатах працавалі кансультацыйныя пункты, праводзіліся дадатковыя практычныя заняткі.**

**Напярэдадні вялікага свята — Дня Савецкай Арміі — адбылася навукова-практычная канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў універсітэта па праблеме «Ваенна-патрыятычнае выхаванне студэнцкай моладзі». Падрыхтаваны цікавыя даклады аб рабоце ваеннай кафедры універсітэта, ваенна-патрыятычным выхаванні ў ходзе працоўных семестраў, па выніках пошуку безымянных герояў.**

**Штаб працоўных спраў пры камітэце камсамола пачаў работу па арганізацыі атрадаў для працоўнага семестра 1973 года, які прысвячаецца 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.**

**Факультэцкія пярвічныя арганізацыі актыўна ўключыліся ў раённы агляд-конкурс на лепшае апавяданне, нарыс аб студэнцкім жыцці, лепшы фотаздымак, лепшую песню аб савецкай моладзі.**

# НЕ ЛЕПШЫ ВЫНІК

Мінула яшчэ адна сесія. Як прайшла яна для нас, студэнтаў III курса хімічнага факультэта? Вядома, што трэці курс на нашым факультэце з'яўляецца самым складаным. Таму камсамольскае бюро накіравала ўвагу на паляпшэнне бягучай паспяховасці. У семестры і напярэдадні сесіі шмат гаварылі аб тым, што сесія будзе самай цяжкай з усіх. Дык як жа мы яе здалі? Лічбы гавораць, што па паспяховасці наш паток заняў далёка не першае месца на факультэце: з трох груп самая нізкая паспяховасць у першай групе — сярэдні бал 3,81, самая высокая ў другой, сярэдні бал якой 4,04. Прычым цікавы наступны факт: калі першая група на працягу першага і другога курсаў была лепшай, то цяпер яна займае амаль апошняе месца. Відаць, толькі складанасцю і цяжкасцю экзаменаў гэта не растлумачыш, таму што для кожнай групы экзамены аднолькавыя. Прычына хутчэй у безадказнасці, у нізкай арганізацыйнай рабоце камсамольскага актыву гэтай групы.

І яшчэ засмучае больш нізкая паспяховасць усяго патока ў параўнанні з папярэднімі сесіямі. Канешне, у многім адбілася цяжкасць сесіі, складанасць экзаменаў. Так, напрыклад, мы здавалі экзамены па ваеннай падрыхтоўцы, гістмату, выбраных раздзелах тэарэтычнай механікі, фізметадах у хіміі і фізічнай хіміі. Трэба адзначыць, што апошнія тры экзамены аказалі значны ўплыў на вынік сярэдняга бала.

Па-мойму, яшчэ не кожны студэнт, не кожны камсамолец разумее, што асноўная яго задача — вучоба.

Абмеркаваўшы на агульным сходзе «Кожнай групе, кожнаму камсамольцу — ударную справу» вынікі зімовай сесіі, улічыўшы ўсе недахопы, мы зможам вызначыць першачарговыя задачы. Асноўная цяжкасць у гэтай рабоце кладзецца на плечы камсамольскага бюро, актыву.

**І. БОЛБАС,**
**сакратар камсамольскага бюро патока III курса хімфака.**



*23 лютага аўдыторыі ваеннай кафедры пуставалі, а будучыя афіцэры прыйшлі ў музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, каб яшчэ раз прайсці тут урок гераізму і мужнасці на прыкладзе старэйшых пакаленняў.*

*Студэнты сустрэліся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, прагледзелі дакументальны фільм аб палкаводцах Савецкай Арміі, азнаёміліся з экспанатамі музея.*

*НА ЗДЫМКУ: група студэнтаў і ветэранаў вайны ў зале музея.*

*Фота А. САПЕРАВА*

# ВЕСТКІ З ЮРФАКА

Падведзены вынікі конкурсу на лепшы верш, лепшую песню і лепшы фотаздымак, які быў прысвечан 50-годдзю ўтварэння СССР. Пераможцамі сталі Сяргей Мачалаў (яго песня аб Беларусі аднадушна прызнана лепшай), Уладзімір Дораш (лепшы фотаздымак) і Уладзімір Краюшкін (лепшы верш).

* * *

На юрыдычным факультэце па ініцыятыве студэнтаў створан тэатр мініяцюр, кіраўніком якога з'яўляецца Генадзь Лісоўскі — адказны за культурна-масавы сектар камітэта камсамола. У хуткім часе студэнты змогуць азнаёміцца з першымі пастаноўкамі гэтага тэатра.

* * *

Праведзен рэйд-праверка пад назвай «Твой рабочы дзень, студэнт». Члены камітэта камсамола Ніна Казей, Фёдар Зафіцэвіч і іншыя пабывалі ў інтэрнаце, паглядзелі, як праводзяць свой рабочы дзень будучыя юрысты, чым яны займаюцца ў вольны час. Аб назіраннях за жыццём сваіх таварышаў рэйдаўцы расказалі ў выпушчанай імі фотагазеце.

* * *

Нядаўна на першым курсе прайшоў цікавы дыспут на тэму «Вобраз савецкага юрыста ў літаратуры», ініцыятарам якога з'явілася VI група. Юнакі і дзяўчаты расказалі аб жыцці і нялёгкай працы савецкіх чэкістаў, падзяліліся ўражаннямі аб прачытаных кнігах.

* * *

Нядрэнна вядзецца на факультэце спартыўна-масавая работа. На першынстве БДУ па валейболу жанчыны занялі 2-е месца (капітан каманды Якуціна). Найбольш вызначыліся ў гульні Мяснікава, Лагодзіч, Краўцова, Стрышычэнка.

* * *

Праведзены спаборніцтвы сярод каманд юрфака па лёгкай атлетыцы і настольнаму тэнісу. Месцы размеркаваліся наступным чынам: лёгкая атлетыка: I месца — першы курс, II месца — другі курс, III месца — чацвёрты курс; настольны тэніс: I месца — другі курс, II месца — трэці курс, III месца — першы курс.

**Н. НОВІКАВА.**



Першае экзаменацыйнае выпрабаванне пройдзена паспяхова, таму і настрой у гэтых юнакоў вельмі добры.

НА ЗДЫМКУ (злева направа): Абдул Самад Азфер (Афганістан), Хо Хыу Б'ет (ДРВ), Мухамад Ліакат Алі і Сабер Ахмед (Бангладэш), Нгуен Хай Тхань (ДРВ) і Мухамад Каймун Хан (Бангладэш).

Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.

# ПЕРШАЯ СЕСІЯ

Вось і закончылася першая сесія ў СССР для замежных студэнтаў падрыхтоўчага факультэта. Засталіся ва ўспамінах бяссонныя ночы, хваляванні перад экзаменам, строгія твары выкладчыкаў. Па-рознаму здалі першую сесію студэнты. Адны добра, другія выдатна.

Нгуен Хай Тхань закончыў у 1972 годзе спецыяльную школу, якая ў час вайны была эвакуіравана з Ханоя. Выпускныя экзамены Тхань здаў выдатна.

— Першая сесія ў СССР была для мяне шчаслівай. Усе прадметы здаў на выдатна. Я верыў у сябе, шмат займаўся, стараўся,— расказвае Тхань. — Раней думаў, што экзамены здаваць вельмі цяжка, але калі шмат вучыш, усё ведаеш— гэта зусім лёгка.

Мухамад Ліакат Алі прыехаў у СССР з Бангладэш. У 1969 годзе скончыў каледж і паступіў ва універсітэт. Студэнты гэтага універсітэта часта ўдзельнічалі ў дэманстрацыях, мітынгах. Алі здаваў ужо дзве сесіі: першую дома, другую ў Мінску. Я папрасіла расказаць аб гэтым падрабязней.

— Першая сесія запомнілася мне назаўсёды. Гэта быў час барацьбы за незалежнасць. Студэнты здалі ўжо шэсць экзаменаў, як раптам рэктар заявіў аб закрыцці універсітэта. Дзевяць месяцаў працягвалася барацьба супраць урада Пакістана. І толькі пасля таго, як Бангладэш атрымала незалежнасць, заняткі аднавіліся. Я вельмі хваляваўся, таму што вынік экзамена нам гавораць не адразу, а праз пятнаццаць-трыццаць дзён. Як толькі заняткі аднавіліся, нам прыйшлося даздаваць яшчэ пяць экзаменаў. Сесію дома я здаў паспяхова. Затым мне прапанавалі працягваць вучобу ў СССР.

Крыху было страшнавата, я ведаў, што ў Савецкім Саюзе ўсе прадметы чытаюцца на рускай мове. Думаў, будзе вельмі цяжка, але нават не падазраваў, што змагу так палюбіць рускую мову. Зараз гэта самы любімы мой прадмет. Гэтую сесію ў Мінску я здаў на выдатна.

Сабер Ахмед таксама з Бангладэш. Ён вучыўся ва універсітэце, але здаць сесію не паспеў: пачалася вайна.

— Я рыхтаваўся вельмі старанна да сваёй першай сесіі, — прадаўжае Сабер расказ сябра.—Здаваць хімію, матэматыку, фізіку мне было не цяжка, таму што гэтыя прадметы я ўжо вывучаў. А вось экзамен па рускай мове быў для мяне самым сур'ёзным. Я вельмі хваляваўся, таму што хацеў гаварыць без памылак. Гэты бар'ер пераадолеў: на экзамене па мове атрымаў выдатна. Мару і будучыя сесіі здаваць на «пяць».

**І. МАЗУРКЕВІЧ.**

СУСТРЭЧЫ З ЦІКАВЫМІ ЛЮДЗЬМІ

# ДВАЦЦАЦЬ ПЯЦЬ МОЎ

**Я чакаў убачыць пажылога вучонага з вялікім жыццёвым вопытам, а адчыніў дзверы малады чалавек, якога хацелася назваць Сярожам, а не Сяргеем Рыгоравічам. Здавалася, ён нядаўна прыбег з лекцый і, перакусіўшы на хаду, рынецца ў кіно. Лекцыі на самай справе толькі што закончыліся. Сяргей Рыгоравіч Халіпаў іх чытаў сам у Ленінградскім педагагічным інстытуце імя Герцэна. І на «перакусіць» у яго не засталося часу, таму што даваўлося даваць інтэрв'ю.**

**Пра чалавека перакануча сведчаць дамашнія абставіны. Тут горы слоўнікаў, кніг на розных мовах, часопісаў займалі ўвесь пакой. Мы так і гутарылі, абклаўшыся імі.**

— Пачалося з калекцыі марак, — расказваў Сяргей Рыгоравіч. — Хацелася прачытаць надпісы на іх, і я стаў вучыць англійскую мову. Потым у школе вывучаў нямецкую. Захапіўся геаграфіяй, гадзінамі поўзаў па разасланай на падлозе карце, здзіўляючыся незразумелым назвам. Каб іх расшыфраваць, дзвюх моў ужо не хапала. Вырашыў вучыць для пачатку фінскую. Нейк натрапіў на выданне «Апавяданняў пра Дзяржынскага» на фінскай мове; купіў, а ў бібліятэцы ўзяў кнігу на рускай мове. Узяўся чытаць, супастаўляючы абодва тэксты. Каб канчаткова засвоіць мову, даваўся такім жа чынам адолець «Два капітаны». Словам, пасля дзесяцігодкі я ведаў пяць моў: прыбавіліся шведская і французская.

**— А цяпер!**

— «Мае» мовы падзяляюцца на дзве групы. Актыўныя — тыя, якімі я валодаю свабодна: англійская, шведская, дацкая, нарвежская, ісландская, галандская, фінская, венгерская, эстонская, літоўская, латышская, італьянская, ірландская, валійская і фарэрская. Пасіўныя — магу чытаць, ведаць граматычны лад, але карыстаюся слоўнікам: гэта іспанская, румынская, арабская, шатландская, брэтонская, польская, бурская. Усяго дваццаць пяць, вядома, з рускай.

**— Сяргей Рыгоравіч, існуе меркаванне, што, валодаючы адной мовай, лёгка вывучыць другую, той жа моўнай групы. Як у такім выпадку Вы падабраліся, напрыклад, да арабскай!**

— Гэта так: пасля французскай мне даволі лёгка даліся італьянская і іспанская... Арабская? Наведваў лекцыі на факультэце ўсходазнаўства Ленінградскага універсітэта. Праз тыдні два «перайшоў» з першага курса на трэці, там і закончыў асваенне мовы. Але гэта нялёгка, я нічым іншым не займаўся, з раніцы да вечара зубрыў.

**— І ўсё ж колькі, на Ваш погляд, патрэбна часу на вывучэнне адной мовы!**

— Схільнасць да гэтага, вядома, адыгрывае вялікую ролю. Я ў сваёй педагагічнай практыцы назіраў такую з'яву: калі ў чалавека развіт музычны слых, яму лёгка навучыцца вымаўляць словы чужой мовы. Што датычыцца тэрміну, цяжка вызначыць сярэднюю працягласць. Правільная руская прымаўка: «Терпение и труд все перетрут».

**— А цяпер Вы папаўняеце свой «поліглатычны» запас!**

— А як жа, вывучаю адразу тры: баскскую, грузінскую і армянскую.

**— І, што, кожны можа так!**

— Кожны. Калі ў яго хопіць цярпення, жадання, сілы волі і энергіі.

**Алег НОСАЎ. [«Неделя»].**





*НА ЗДЫМКУ: лекцыю па курсу «Тэарэтычныя асновы кваліфікацыі злачынстваў» чытае трэцякурснікам юрфака прафесар І. І. Гарэлік.*

Фота Д. ЧАХОВІЧА.

# РАСКАЗВАЮЦЬ гісторыкі

## КАЛІ ТАБЕ РАДЫ

Туды, дзе табе рады, хочацца прыйсці, прыехаць не раз. Гэта цудоўна — прыносіць людзям радасць, адказваць на іх прывітальныя ўсмешкі. Іменна ў такой дружнай атмасферы аказалася агітбрыгада нашага гістарычнага факультэта ў вёсцы Засулле Стаўбцоўскага раёна.

У прасторнай зале Дома культуры сабралася чалавек 400, не толькі вучні школы, але і калгаснікі. Усе з неаслабнай увагай выслухалі даклад студэнта І курса аддзялення філасофіі Генадзя Хухлындзіна, прысвечаны 55-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Генадзь праявіў сапраўдную камсамольскую аператыўнасць. Тут жа, пагаварыўшы са старшынёй сельсавета, ён даведаўся аб ратных і працоўных справах мясцовых жыхароў. Гэтыя факты былі выкарыстаны ў дакладзе.

Слухачы засталіся задаволены і выступленнем агітбрыгады. Дружны смех раздаваўся ў зале, калі на сцэну выходзілі Лена Шаўчэнка, Анатоль Касцецкі, Генадзь Кулажанка, Аксана Ёркіна, Сяргей Кавалёў, Яўген Крамко. Яны паказалі шэраг эпізодаў з жыцця студэнтаў. Інструментальны ансамбль у саставе Эдуарда Доўнара, Юрыя Андрэйчанкі, Ігара Цаляховіча, салісткі Таццяны Баляснікавай выканаў некалькі цікавых нумароў.

— Мы вельмі задаволены выступленнем агітбрыгады, — гаворыць Валя Панова, сакратар камсамольскай арганізацыі школы.

Затым завуч школы Вікенцій Васільевіч азнаёміў нас са школай. Рукамі рабят тут абсталяваны кабінеты гісторыі, біялогіі, хіміі, розныя стэнды. Школа — удзельніца ВДНГ. З вялікай цікавасцю агледзелі мы стэнд нумізматыкі, слясарны станок, сканструяваны і зроблены вучнямі старэйшых класаў.

Усе ўдзельнікі агітбрыгады засталіся задаволены паездкай. Дырэкцыя школы выказала пажаданне часцей бачыць нас у сябе ў гасцях.

Туды, дзе табе рады, хочацца прыехаць з добрай весткай не раз. Пастараемся, каб так і было на справе.

**Н. ШАЎЧЭНКА,**
член шэфскага сектара камітэта камсамола гістфака.





*Першыя практычныя заняткі ў гэтым семестры на III курсе гістфака вядзе старшы выкладчык кафедры новай і навейшай гісторыі Кацярына Андрэеўна Далгучыц. Адказвае Аляксандр Гурловіч.*

# біёлагі

## РАСЛІНЫ-ЛЕКАРЫ

Са старажытных часоў вядома прымяненне раслін пры лячэнні многіх захворванняў. І ў нашы дні цікавасць да лекавых раслін не згасае. Чым гэта растлумачыць? У большасці сваёй яны малатаксічныя, не выклікаюць пабочнага ўздзеяння на арганізм і таму ахвотна выкарыстоўваюцца ў дамашнім ужытку (ліпавы чай, валяр'янавыя каплі, адвар кветак валошкі сіняй).

У Дырэктывах XXIV з'езда КПСС пастаўлена задача забяспечыць патрабаванні насельніцтва краіны ў высокаэфектыўных лекавых сродках. А сярод іх важнае месца займаюць прэпараты з раслiннай сыравіны. Напрыклад, пры лячэнні нырак, пячонкі пераважна карыстаюцца раслiннымі прэпаратамі, а сродкі, якія стымулююць сардэчную дзейнасць, амаль на 90 працэнтаў гатуюцца з раслін.

Фармацэўтычная прамысловасць атрымлівае больш 50 працэнтаў раслiннай сыравіны са спецыялізаваных саўгасаў, а астатняе — ад нарыхтоўшчыкаў дзікарослых лекавых раслін. У нас у Беларусі ў Гродзенскай вобласці ёсць саўгас «Вялікае Мажэйкава», на плантацыях якога вырошчваюцца такія лекавыя расліны, як валяр'яна лекавая, рамонак аптэчны, спарынння, наготкі лекавыя і інш.

Але запатрабаванні аховы здароўя ў цяперашні час задавальняюцца далёка не поўнасцю. Вось чаму неабходна выявіць новыя месцы нарыхтоўкі дзікарослых лекавых раслін. І беларускія батанікі вядуць работу па адшуканню новых відаў лекавых раслін, вывучаюць іх распаўсюджанне.

Калектыў кафедры сістэматыкі раслін непасрэдна займаецца праблемай распаўсюджання і выяўленнем запасаў лекавых раслін Мінскай вобласці.

У час летніх канікул у адной з экспедыцый прымала ўдзел і я. Экспедыцыя працавала на тэрыторыі Вілейскага раёна. Было даследавана 10 лясніцтваў агульнай плошчай 74,4 тыс. гектараў. Займаліся мы вывучэннем відавога саставу лекавых раслін у розных тыпах лесу, у розных асацыяцыях, а таксама ўлічвалі не толькі расліны на данай плошчы, але і сухую сыравіну.

На аснове папярэдніх даных вызначылі запас сыравіны 19 відаў лекавых раслін на данай плошчы. Так, напрыклад, запас сухога лісця брусніці складае 102,2 тоны на плошчы 973,6 гектара, запас кары крушыны — 12,75 тоны на плошчы 482,7 гектара, запас свежых ягад ядлоўцу — больш 4 тысяч штук на плошчы 302 гектары, а чарніцу можна нарыхтоўваць на плошчы 1330,6 гектара.

Такім чынам, даследаванні батанікаў дапамогуць планава, рацыянальна, без урону для прыроды праводзіць нарыхтоўкі лекавых раслін у якасці сыравіны для прыгатавання каштоўных лекавых прэпаратаў.

**А. БАЛАХОНАВА,**

### ВЫПРАБАВАННЕ ПРАКТЫКАЙ

## Што яна дала мне?

Мая педагагічная практыка, як і ў А. Казей, Г. Кірэйчык, О. Яруты, Е. Сірэнкі, праходзіла ў школе № 28 г. Мінска пад кіраўніцтвам метадыста Галіны Іосіфаўны Зубкевіч.

Група наша была вельмі дружная. Кожны імкнуўся дапамагаць адзін аднаму. Ніхто не крыўдзіўся, калі яму гаварылі аб памылках. На тое ж і практыка, каб вучыцца. А памылак было шмат. Гавораць, што майстэрства прыходзіць з гадамі. Гэта так. І наша задача — вучыцца майстэрству, хоць гэта і нялёгка.

Мы пабывалі на многіх уроках. Адны настаўнікі могуць зацікавіць, прымусіць слухаць сябе, а ў іншых гэтага няма: у класе шумна, кожны займаецца сваёй справай. Чаму так атрымліваецца? Адказаў можа быць многа. Але мне здаецца, што ўсё залежыць ад настаўніка.

Мы ўсе з нецярпеннем чакалі свой першы ўрок. Чакалі і баяліся. Першы ўрок, які я давала, быў у восьмым класе. Вельмі хвалявалася. Яшчэ за некалькі дзён стала рыхтавацца да яго. Прачытала шмат дадатковай літаратуры.

І вось наступіў гэты дзень. Увайшла ў клас. На мяне глядзяць 38 вучняў. Якія яны ўсе розныя! Я больш за ўсё баялася, што мяне не будуць слухаць. Але ўсё аказалася зусім не так, як я думала.

Урок прайшоў добра, хоць і не без недахопаў. З кожным новым урокам станавілася ўсё лягчэй і лягчэй.

Затым была стажорская практыка, у час якой мы самастойна вялі ўрокі. Спачатку я ў сваіх класах (6-м «А» і 8-м «Б») адчувала цяжкасці з дысцыплінай, але потым удалося знайсці ключы да характараў рабят. Гэта была вялікая радасць. Я адчула, што дзеці бачаць у маёй асобе не студэнта-практыканта, а настаўніка.

Хутка праляцелі школьныя практычныя дні. І вельмі сумна было развітвацца з настаўнікамі, якія многаму навучылі, з вучнямі, якія нам прыносілі і засмучэнні і радасці і якіх мы паспелі палюбіць.

За час практыкі я навучылася працаваць з калектывам, разумець дзяцей, папярэджваць іх жаданні, накіроўваць іх думкі ў патрэбнае рэчышча, знаходзіць цікавае ў самым звычайным.

Я разумею, каб стаць добрым педагогам, трэба мець прызванне, трэба любіць дзяцей, шмат працаваць, чытаць.

**В. ПАДАЛІНСКАЯ,**
студэнтка V курса біяфака.

## Гартаючы дзённік

Ужо хутка многія студэнты нашай кафедры паедуць у экспедыцыі і будуць працаваць па гаспадарча-дагаворных тэмах. Мы раскажам аб рабоце першай такой экспедыцыі, якая вывучала запасы лекавых раслін Мінскай вобласці.

Шмат клопатаў было з арганізацыяй экспедыцыі, закупкай неабходнага абсталявання, рукзакоў, посуду, прадуктаў. І вось у чэрвені група ў саставе 10 чалавек выехала для даследавання Валожынскага раёна. За 19 дзён работы амаль увесь раён быў вывучан.

Працавалі штодзень больш дзесяці гадзін, матэрыялы стараліся апрацаваць па магчымасці адразу.

У першыя дні вельмі цяжка было прымяняць методыку палявых работ на практыцы, але хутка асвоіліся, і справы пайшлі хутчэй. Цяжкасць была і ў тым, што прыходзілася даследаваць вялікія масівы лесу, 500—800 га, пехатою хадзілі па 8—10 гадзін. Машына была з намі не ўвесь час, таму калі-нікалі карысталіся спадарожным транспартам, каб пад'ехаць да далёкіх участкаў лесу.

Калектыў наш аказаўся дружным. Жылі весела, нягледзячы на ўсялякія бытавыя і кліматычныя нягоды. Адразу высветлілася, што кожны з нас валодае якімісьці здольнасцямі, і ў цэлым гэта было цудоўна.

Начальнікам нашай экспедыцыі была Аляксандра Кузьмінічна Яфрэмкіна, чулы і клапатлівы чалавек, уважлівы і строгі педагог.

Была з намі і Наталля Канстанцінаўна Кудрашова, кіраўнік нашых курсавых і дыпломных работ, вельмі вясёлая і жыццярадасная. Яе заўсёды бадзёры настрой перадаваўся і нам: дзвюм пяцікурсніцам, пяцярым першакурснікам.

Сярожа Емяльянаў да таго ж аказаўся выдатным змеяловам. Жывых гадзюк ён хаваў у палатняных мяшочках, а потым перадаў іх на кафедру.

Шура Вадэйка вылучыўся кулінарнымі здольнасцямі. Гэта ён прыдумаў фірменнае блюда: кісель тыпу п/п (паходна-палявы) з ахаладжваннем па закону Вадэйкі.

Штодзень вялі дзённік экспедыцыі. Цяпер прыемна перагартаць старонкі, успомніць экспедыцыйны час. Мы пабывалі ў Івянцы, Першаях, Белакорцы, Барсуках, Вішневе, Багданаве, пазнаёміліся з многімі цікавымі людзьмі, сабралі патрэбны матэрыял па гаспадарча-дагаворнай тэме.

У гэтым годзе працаваць будзе лягчэй, таму што восенню пры апрацоўцы даных былі ўлічаны ўсе памылкі летніх работ. Цяпер мы канкрэтна ведаем, што і як рабіць.

Рукзакі і палаткі чакаюць членаў новых экспедыцый.

**Л. СІРЭНКА,**
**С. БАБІЧ,**
**пяцікурсніцы.**

# географы

## АЛМАЗНАЯ І ЗАЛАТАЯ

Хто з нас, географаў, не марыў пабываць на Поўначы, у краіне пякучых марозаў, мноства рэк і азёр, магутных лясоў, алмазаў і золата, не марыў убачыць усю яе прыгажосць! Мае бацькі ўжо тры гады жывуць і працуюць у Якуціі, у Айхале. І я два разы пабывала там. Цяжка знайсці словы, каб найбольш поўна ахарактарызаваць гэтую рэспубліку. Лепш за ўсё падыходзіць — бяскрайнасць. Такой тэрыторыі не маюць многія дзяржавы свету. Якуція — гэта царства тайгі, холаду, спакою і цішыні.

Мароз градусаў пад пяцьдзесят. Нерухомыя лясныя велiканы-лістоўніцы. Яны як бы замерлі пад цяжкасцю белых шапак снегу. Шчодра ўсыпаныя снегам, адліваючыя блакітам, дрэвы выглядаюць вельмі ўрачыста. Калі-нікалі па тайзе разнясецца гулкі трэск—гэта зламаўся сучок, які не вытрымаў цяжкасці снегавога грузу.

Мне ў тайзе прыйшлося назіраць дзіўны малюнак. З утульнага гняздзечка, умацаванага амаль на самай верхавіне лістоўніцы, паказалася смешная, забаўная мордачка. Вострыя вушкі упрыгожаны кутасікамі. Вавёрка паводзіла чорнымі вачыма-бусінкамі і скокнула на галінку. Села, ускінуўшы пушысты хвост, затым лёгка і грацыёзна пераскочыла на суседняе дрэва, адарвала шышку, падхапіла яе пярэднімі лапкамі і на дзіва спрытна стала вылушчваць семечкі. На снег пасыпалася шалупінне.

Даводзілося мне ўбачыць і вяртанне паляўнічых з тайгі з багатай здабычай. Якуцкае футра славіцца сваёй прыгажосцю, трываласцю і карыстаецца найбольшым попытам не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Кожны сапраўдны якуцянін — заядлы паляўнічы, як у прымаўцы: «У доброго молодца в левой руке черный соболь».

А язду на аленях нават нельга ні з чым параўнаць. Адзін неасцярожны рух — і будзеш у снезе. Пабывала я і на ўзбагачальнай фабрыцы, у спецлабараторыі. Фабрыка знаходзіцца за пасёлкам, але яе відаць з любой кропкі Айхала. Калі я ўвайшла ў лабараторыю, нават крыху разгубілася. Сцены аздоблены кафлянымі плітамі, агрэгаты афарбаваны ў светлыя таны, усюды кветкі і мноства лямп дзённага святла. Работа вельмі напружаная і адказная, нельга ні на хвіліну адарвацца. Калі ў нябачных промнях рэнтгенапарата ярка блісне крышталь-алмаз, яго трэба асцярожна прыхапіць пінцэтам і апусціць у спецыяльную скрынку. Не разумею, як у некаторых людзей алмаз можа выклікаць прагу нажывы. Большасць людзей захапляецца толькі дасканаласцю, закончанасцю форм асобных камняў, створаных прыродай.

На Поўначы амаль на кожным кроку сустрэнеш праяўленне шчырай дружбы мясцовых жыхароў. Хочацца ў канцы прывесці вершы якуцкага паэта Леаніда Папова:

Ребята с Волги и Оки,
Вы приезжайте к нам
на Лену!
Край неизведанной тайги
Понравится вам
непременно.
Не бойтесь лютых наших
зим!
Хотя свирепа наша стужа,
Однако мы ее сразим
Большим огнем горячей
дружбы.
А летом выйдете на луг—
Увидите, какое солнце,
Что станет жарко вдруг,
и юг
Невольно вспомнить вам
придется.
У нас такая целина,
Которой нет конца и
краю...
Вас ждет прекрасная
страна,
Алмазная и золотая.

**Л. КРАЎЧАНКА,**
студэнтка II курса.

# СПОРТ

## БЕЛАРУСЬ–ПРЫБАЛТЫКА

Сталічныя універсітэты рэспублік Прыбалтыкі і Беларусі ўжо маюць пяцігадовы вопыт правядзення традыцыйных сустрэч, аднак такія сустрэчы да гэтай пары абмяжоўваліся толькі спартыўнымі гульнямі. Улічваючы шырокае развіццё фехтавання ў Мінску, спартыўны клуб нашага універсітэта ўзяў на сябе ініцыятыву ў правядзенні традыцыйных турніраў фехтавальшчыкаў. У мінулую суботу і нядзелю адбыліся першыя такія спаборніцтвы. Яны выклікалі вялікую зацікаўленасць, таму што з'яўляліся вельмі важнымі ў падрыхтоўцы да студэнцкага першынства рэспублікі.

Для ўдзелу ў гэтых спаборніцтвах былі запрошаны каманды Латвійскага і Вільнюскага універсітэтаў, Талінскага і Беларускага політэхнічнага інстытутаў і Мінскага інстытута замежных моў. Наш універсітэт выступаў дзвюма камандамі.

У адрозненне ад усіх папярэдніх сустрэч спаборніцтвы праводзіліся па поўнай праграме ў выглядзе асабістага і каманднага першынства.

У асабістых спаборніцтвах на рапірах поспех спадарожнічаў студэнтам БДУ А. Якубовічу (І курс юрфака) і А. Комскаму (V курс біяфака). Яны занялі першае і другое месцы. На трэцяе месца выйшаў студэнт Талінскага політэхнічнага інстытута А. Застэр.

У шпажыстаў па-за канкурэнцыяй быў выпускнік нашага універсітэта, аспірант, майстар спорту А. Нечэпурэнка, другое месца заняў В. Масееў і трэцяе — В. Мяснікаў (спартыўны клуб БДУ).

Паспяхова выступае ў гэтым сезоне першакурсніца гістарычнага факультэта Таццяна Дронь. Яна заваявала тытул чэмпіёна юнацкага першынства г. Мінска, стала чэмпіёнкай студэнцкага першынства рэспублікі і заняла III месца на Усесаюзных юнацкіх спаборніцтвах ДСТ «Буравеснік».

У пяці фінальных баях цяперашніх спаборніцтваў Таццяна атрымала толькі чатыры уколы і заняла першае месца, на другім Н. Маркові — Латвійскі універсітэт і на трэцім Р. Файман — Эстонскі політэхнічны інстытут.

У спаборніцтвах на саблях прадстаўнікі БДУ не змаглі прабіцца ў фінал. Першае і другое месцы занялі студэнты Мінскага інстытута замежных моў В. Дарожкін і В. Кастрачэнкаў, трэцяе — Б. Бурштэйн (Латвійскі універсітэт).

У камандных спаборніцтвах лепш за ўсіх выступілі спартсмены Беларускага універсітэта (5 ачкоў), якія ўпэўнена выйгралі першае месца ў мужчынскай і жаночай рапіры, шпазе і занялі другое месца па фехтаванню на саблях, прапусціўшы ўперад добра падрыхтаваную каманду Мінскага інстытута замежных моў. Астатнія месцы размеркаваліся наступным чынам:

II месца — Латвійскі універсітэт — 12 ачкоў;

III месца — Мінскі інстытут замежных моў — 13 ачкоў;

IV месца — Беларускі політэхнічны інстытут — 14 ачкоў:

V месца — БДУ (другая каманда)—17 ачкоў;

VI месца — Талінскі політэхнічны інстытут — 23,5 ачка;

VII месца — Вільнюскі дзяржаўны універсітэт — 27,5 ачка.

**В. ХРЭНАЎ,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў.**



*У мінулым годзе яшчэ студэнт біяфака, ленінскі стыпендыят, цяпер аспірант Аляксандр Нечэпурэнка ўжо ў час вучобы ў БДУ выканаў нарматыў майстра спорту.*

*У 1972 годзе ён заваяваў званне чэмпіёна г. Мінска, зараз уваходзіць у састаў зборнай рэспублікі і працягвае напружана трэніравацца.*





**СЕМНАЦЦАТАГА лютага адкрылася першынство універсітэта па баскетболу. У спартыўнай зале рознакаляровымі калонамі выстраіліся зборныя каманды факультэтаў, якія прымаюць удзел у парадзе адкрыцця спаборніцтваў.**

**Пад гукі Дзяржаўнага Гімна і Гімна БССР капітан жаночай зборнай універсітэта студэнтка геафака Л. Жабінская падымае флаг спаборніцтваў.**

**З прывітальным словам да спартсменаў звярнуўся загадчык аддзела спартыўных гульняў рэспубліканскага камітэта па фізкультуры і спорту пры Савеце Міністраў БССР А. П. Іваноўскі. Ён уручае залатыя медалі членам жаночай зборнай БДУ па баскетболу, якая заняла першае месца ў спартакіядзе БССР сярод вну.**

# АДДАВАЦЬ УСЯГО СЯБЕ

**Разам з усімі атрымлівае медаль і Рэгіна Чыпайтэ. Для яе гэта, напэўна, самая сумная ўзнагарода. Сёння яна развітваецца з вялікім спортам.**

**Гуляць у баскетбол Рэгіна пачала ў невялікім літоўскім горадзе Цельшай, у дзіцячай спартыўнай школе. Выступала за зборную школьнікаў Літвы, а затым, яшчэ зусім юнай, за каманду майстроў каунаскага «Політэхніка», якая выступала ў першынстве краіны.**

**Дзесяць гадоў назад Рэгіна Чыпайтэ пераехала ў Беларусь і паступіла на гістарычны факультэт, дзе цяпер працуе лабаранткай кафедры новай і навейшай гісторыі. І вось ужо дзесяць год яна выступае за зборную каманду універсітэта.**

**— Рэгіна — сапраўдны баец,—гаворыць трэнер Георгій Міхайлавіч Грудо. — Я не прыпомню сустрэчы, дзе б яна дазволіла сабе расслабіцца, згуляць у паўсілы. Заўсёды вельмі ўважлівая на пляцоўцы, акуратная. І можна смела сказаць, што ўсе поспехі нашай каманды звязаны з імем Р. Чыпайтэ. Калі камандзе было цяжка, яна, нягледзячы на траўмы, выходзіла на пляцоўку, хутка наводзіла парадак, хоць, магчыма, прыходзілася сціскаць ад болю зубы. Гэтым і вызначаецца сапраўдны спартсмен.**

**А вось што гаворыць сама Рэгіна Чыпайтэ:**

**— Па-мойму, гуляць трэба заўсёды ад пачатку да фінальнай сірэны, усяго сябе аддаваць гульні, інакш не варта звязваць сваё жыццё са спортам.**

**У сваім спартыўным жыцці Рэгіна не капіравала гульню прызнаных аўтарытэтаў, яна мела свой, асабісты баскетбольны почырк.**

**Да сённяшняга дня Р. Чыпайтэ—ганаровы майстар спорту, шасцікратная пераможца першынства БССР сярод вну, уладальнік кубкаў горада і БССР і інш.**

**Яна ўдзельніца трох спартакіяд народаў СССР, у якіх прымала ўдзел зборная БССР. І на ўсе гульні каманду нашай рэспублікі выводзіла на пляцоўку яе капітан — Рэгіна Чыпайтэ. Строгая, дакладная гульня яе заўсёды была карыснай камандзе. Ігрок абароны, яна з поспехам магла згуляць і крайняга нападаючага, калі ў гэтым была неабходнасць. І сотні разоў аранжавы мяч, апісваючы плаўную траекторыю, зададзеную рукой Рэгіны, пападаў у карзіну і прымушаў адных балельшчыкаў радавацца, другіх — засмучацца.**

**Яна б магла яшчэ гуляць: так лічыць і яе трэнер, і яна сама. Але цяжкая траўма не дазваляе працягваць выступленні на тым жа высокім узроўні, а горш яна не можа, не дазваляе характар сапраўднага спартсмена. А сапраўдны спартсмен ведае, калі трэба развітацца са спортам, як бы цяжка ні было, каб пакінуць аб сабе добрую памяць.**

**І вось Р. Чыпайтэ развітваецца са спортам. Яна перадае сваю баявую спартыўную форму юнай баскетбалістцы вучаніцы 109-й сярэдняй школы горада Мінска Ганне Трунінай.**

**Шмат цёплых слоў было сказана Рэгіне ад імя кіраўніцтва універсітэта, спартыўнай кафедры. Не забылі сваю сяброўку і дзяўчаты з каманды «Радыётэхнік», за якую яна выступала шмат гадоў. Ва ўрачыстых абставінах капітаны каманд падносяць Р. Чыпайтэ кветкі і памятныя падарункі. Канешне, былі слёзы, без якіх не абыходзіцца ні адна падобная падзея.**

**Рэгіна Чыпайтэ пакідае спорт як ігрок, але застаецца ў ім як трэнер. Цяпер яна будзе працаваць з другой зборнай камандай універсітэта. І няма сумнення, што яе вопыт, яе прыклад дапамогуць дзяўчатам стаць вялікімі майстрамі гэтай хуткай, дынамічнай гульні.**

**Затым быў праведзен першы матч першынства. Сустрэліся каманды ФПМ і гістфака. З лікам 68:44 перамаглі матэматыкі.**

**М. ХАРЫТОНАЎ.**



## НОВЫЯ КНІГІ,

### ПАСТУПІЎШЫЯ Ў БІБЛІЯТЭКУ БДУ Ў ЛЮТЫМ

1. В. И. Ленин и научные основы руководства процессами общественного развития при социализме. Сборник статей. Ульяновск, 1972.
2. Арская, Л. Н. «Открытая экономика» и рабочий класс Японии. М., «Наука», 1972.
3. Белоус, Т. Я. Международные промышленные монополии. М., «Мысль», 1972.
4. Математические методы решения экономических задач. Сб. 3. М., «Наука», 1972.
5. Ольсевич, Ю. Я. Эффективность экономики социализма. Критика буржуазных и ревизионистских концепций. М., «Мысль», 1972.
6. Планомерность в системе экономических отношений социализма. Сб. статей. Ярославль, 1972.
7. Пути повышения эффективности общественного производства. Вып. 1. Л., Изд. Ленинград. ун-та, 1972.
8. Статистика и электронно-вычислительная техника в экономике. Вып. 5. М., «Статистика», 1972.
9. Томчук, П. В. Общественная форма труда при социализме. Вопросы методологии и теории. Львов, Изд-во Львов. ун-та, 1972.
10. Фадеев, Н. В. Многостороннее сотрудничество страны социализма и его значение в современных условиях. М., «Знание», 1972.

# БЕЛЫ–БЕЛЫ...



А люты ўсё прыспешваў зіму са снегам. Снегу чакалі клумбы, накрытыя ад марозу яловымі галінкамі, трава, дротам скручаная ля платоў, іржавеючыя, сіратліва кінутыя ў падваротні санкі. Паэты і закаханыя таксама чакалі гэтага цудоўнага чараўніка, ад якога так чыста і светла становіцца на душы. А пачарнеўшыя дрэвы нават плакалі, раняючы з галінак халодныя лядзяшкі.

Першымі снег убачылі дзеці. Умомант двары былі ўсыпаны дзетварой з канькамі, лыжамі, клюшкамі.

А снег кружыўся, вытанцоўваў у паветры неймаверныя кадрылі і, стаміўшыся, павольна апускаўся на слізкі, вяснушкаваты ад жоўтага пяску асфальт. Як здольны маляр, ён адбельваў пабурэўшыя лаўкі ў скверах, дамы з вадзянымі падцёкамі, глухія лясныя прасекі.

Зацікаўленасці яго не было канца. Снег прыліпаў да аконных шыб, заглядваў у памяшканні, нахіляўся над маўклівымі палямі, спяшаўся прыгалубіць дрэвы.

У той жа час ён быў вельмі сарамлівы. Людзі здзіўляліся яму, хацелі лепш разгледзець, бралі ў далоні, а снег саромеўся і ператвараўся ў сінявокую расінку. Хоць у людзей была процьма разнастайных клопатаў і спраў, усе гаварылі толькі аб ім і, засынаючы, бачылі бліскучыя карагоды з бязважкіх і крохкіх сняжынак.

Да ночы снегапад закончыўся. І толькі ў роўным святле ліхтароў да ранку па вуліцах блукала адзінокая сняжынка, кагосьці шукала і ніяк не магла знайсці.

Шчаслівыя, спалі людзі, дрэвы і снег, які спакойна пахруstваў у сне.

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19. АТ 05101 Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2.000 экз. Заказ 227.